**Міжнародная навуковая канферэнцыя “Гістарычнае мовазнаўства ў кантэксце міждысцыплінарных даследаванняў”**

25–26 кастрычніка 2017 года ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя “Гістарычнае мовазнаўства ў кантэксце міждысцыплінарных даследаванняў”.

Актуальнасць правядзення дадзенай канферэнцыі абумоўлена неабходнасцю абагульнення і ўсебаковага абмеркавання вынікаў навуковых распрацовак у галіне айчыннага дыяхранічнага мовазнаўства (апошняя навуковая канферэнцыя, прысвечаная спецыяльна гэтаму напрамку лінгвістыкі праводзілася ў Інстытуце мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі ў красавіку 2008 г.); патрэбай актывізацыі вывучэння актуальных пытанняў гісторыі мовы; важнасцю каардынацыі дзейнасці па захаванні і выданні старажытнай пісьмовай спадчыны. Падставай правядзення канферэнцыі з’явілася важная падзея ў айчыннай гуманітарстыцы – завяршэнне работы над “Гістарычным слоўнікам беларускай мовы” ў 37-мі выпусках, першым і адзіным у айчыннай навуцы фундаментальным даведнікам, які з максімальнай паўнатой адлюстроўвае багацце слоўнікавага фонду беларускай мовы ў XIV–XVIII стст. і з’яўляецца надзейнай крыніцай пазнання мінулага краіны. Канферэнцыя ўваходзіла ў праграму мерапрыемстваў па святкаванні 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі былі пададзены даследчыкамі з Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, Гомельскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога, Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Полацкага дзяржаўнага эканамічнага каледжа, Вільнюскага ўніверсітэта (Літва), Інстытута мовазнаўства імя А. А. Патабні НАН Украіны, Запарожскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі, Уманскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Паўла Тычыны (Украіна).

Падчас урачыстага адкрыцця канферэнцыі быў зачытаны прывітальны адрас Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэміка НАН Беларусі У. Р. Гусакова; з прывітальнымі словамі выступілі акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, член-карэспандэнт НАН Беларусі А. А. Каваленя, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, акадэмік НАН Беларусі А. І. Лакотка, першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, акадэмік НАН Беларусі А. А. Лукашанец, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, к. ф. н. І. Л. Капылоў.

На пленарным пасяджэнні прагучалі грунтоўныя даклады айчынных мовазнаўцаў па актуальных пытаннях дыяхранічнага мовазнаўства. У дакладзе члена-карэспандэнта НАН Беларусі А. М. Булыкі “Субстантыўная лексіка іншамоўнага паходжання як крыніца «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы»” была паказана роля запазычанай лексікі ў лексічным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

фондзе старабеларускай мовы і растлумачаны спосабы яе лексікаграфічнай рэпрэзентацыі; даклады А. А. Лукашанца “Кнігавыдавецкая дзейнасць Францыска Скарыны ў агульнаеўрапейскім культурным кантэксце”, д. ф. н. Л. Р. Машчэнскай “Демократизация книжно-письменного языка в переводах Ф. Скорины и М. Грека как отражение европейской концепции национальных литературных языков” і д. ф. н. М. Р. Прыгодзіча “Палеаграфічнае даследаванне выданняў Францыска Скарыны” грунтаваліся аналізе розных аспектаў дзейнасці беларускага першадрукара Францыска Скарыны, утрымлівалі ацэнку вынікаў вывучэння і асэнсавання ў сучаснай беларускай і сусветнай гуманітарыстыцы яго багатай спадчыны; д. ф. н. В. А. Ляшчынская ў сваім выступленні “Гістарычны вопыт у люстэрку беларускай фразеалогіі” абгрунтавала значнасць фразеалагічных адзінак у адлюстраванні, захаванні і перадачы вопыту народа з пакалення ў пакаленне. К. ф. н. Н. В. Паляшчук у дакладзе “Стан і перспектывы даследавання старабеларускай пісьмовай спадчыны” на аснове дэталёвага агляду дасягненняў беларускага гістарычнага мовазнаўства акрэсліла далейшыя напрамкі навуковай і практычнай дзейнасці у гэтай галіне айчыннай лінгвістыкі.

На канферэнцыі працавала пяць секцый.

У дакладах, якія былі заслуханы на пасяджэнні секцыі “Гістарычная граматыка і гістарычная стылістыка ў аспекце міжкультурнага і міжмоўнага ўзаемадзеяння”, былі прапанаваны шляхі вырашэння надзённых пытанняў унутранай і знешняй гісторыі беларускай і іншых славянскіх моў, іх кантактавання ў розныя храналагічныя перыяды, магчымыя аспекты аналізу розных па стылёва-жанравай прыналежнасці помнікаў старабеларускай пісьменнасці (даклады Г. І. Кулеш “Паняцце *гістарычная стылістыка*: да праблемы вызначэння зместу”, В. П. Русак “Гісторыя моўнай прасторы Славіі на картах “Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа”, І. У. Будзько “Кніга Прарока Эклезіяста ў перакладзе Францыска Скарыны: мова і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэксталогія”, Н. А. Снігіровай “Да пытання пра статус, ролю і функцыі беларускай мовы ў гісторыі беларуска-польскіх узаемадачыненняў” і інш.).

Даклады секцыі “Гісторыя развіцця граматычнай сістэмы беларускай мовы” адлюстроўвалі станаўленне, развіццё марфалагічнага і сінтаксічнага ладу беларускай мовы, заканамернасці функцыянавання розных граматычных адзінак. Матэрыялам для навуковых даследаванняў выступілі як тэксты XIV–XVIII стст., так і тэксты XX ст. (даклады А. М. Лапцёнак “Словалучэнні з адносінамі прычыны ў тэкстах газеты «Наша Ніва», Т. Я. Максімавай “Даданыя дзейнікавыя сказы: з гісторыі развіцця паняцця”, А. М. Сяргеевай “Асаблівасці функцыянавання некаторых архаічных прыслоўяў у сучаснай беларускай мове”, Г. У. Федарэнка “Некаторыя спосабы выражэння дзейніка ў простым сказе (на матэрыяле помнікаў старабеларускага пісьменства)” і інш.).

Фарміраванне і эвалюцыя лексічнай, фразеалагічнай, тэрміналагічнай сістэм беларускай мовы, іх лексікаграфічная апрацоўка, параўнанне слоўнікавага складу, вынікаў лексіка-семантычных працэсаў у старабеларускай і сучаснай беларускай мовах, канкрэтызацыя ў іх месца і ролі запазычанняў атрымалі абмеркаванне на секцыі “Актуальныя праблемы гістарычнай лексікалогіі, фразеалогіі, гістарычнай лексікаграфіі” (даклады В. М. Нікалаевай “Беларуская лексіка з семантыкай гучання ў яе гістарычным развіцці”, В. І. Уласевіч “Асаблівасці актуалізацыі ўстарэлых запазычаных лексем у сучаснай беларускай мове”, І. У. Ялынцавай “Каларатывы-прыметнікі ў лексічнай сістэме беларускай літаратурнай мовы (этымалагічны аспект)”, С. М. Макітрук “Намінацыі аб’ектнага тыпу ў старабеларускай мове” і інш.).

На секцыі “Актуальныя праблемы гістарычнай анамастыкі і гістарычнай дыялекталогіі” ўвага даследчыкаў была звернута на беларускія тапонімы і антрапонімы, іх тыпы, інтра- і экстралінгвістычныя фактары, якія аказалі ўплыў на іх ужыванне ў мове і маўленні; вучоныя-дыялектолагі прапанавалі свае назіранні над развіццём мясцовых гаворак розных рэгіёнаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларусі, прасачылі асаблівасці ўжывання ў іх складзе семантычных дыялектызмаў, граматычных архаізмаў, запазычанняў з царкоўнаславянскай мовы (Л. В. Леванцэвіч “Юрыдычныя дакументы Брэстчыны XIX ст.: асоба і антрапонім”, Н. М. Сянкевіч “Экстралінгвістычная інфармацыя ў «Анамастычным слоўніку беларускай літаратурнай мовы XIX ст.»”; В. М. Курцова “Архаічнае і новае ў беларускіх гаворках як заканамернасці іх развіцця”, А. С. Дзядова “Семантычныя дыялектызмы ў гаворках Віцебшчыны як крыніца лінгвакраіназнаўчай інфармацыі” і інш.).

Даклады секцыі “Беларуская пісьмовая спадчына як аб’ект вывучэння ў сучаснай гуманітарнай навуцы” ў чарговы раз засведчылі, што беларускія пісьмовыя помнікі XIV–XVIII стст. з’яўляюцца надзейным, прыдатным і ўдзячным даследчыцкім матэрыялам для вучоных розных напрамкаў сучаснай гуманітарыстыкі: літаратуразнаўства, гісторыі, дыпламатыкі, права, архівазнаўства і інш. (А. У. Бразгуноў “Геаграфічная і анімалістычная лексіка пражскіх выданняў Францыска Скарыны”, Г. В. Дзербіна “Мова як элемент прававой культуры грамадства XVI ст. (у кантэксце кадыфікацыі права Вялкага Княства Літоўскага)”, А. Б. Доўнар “Прыгожае слова Мінска (па дакументах мяшчан сярэдзіны XVI ст.)”, В. У. Фурс “Працягваючы справу Францыска Скарыны: сучасныя і беларускія пераклады Святога Пісьма” і інш.). Безумоўна, стаўноўчым вынікам работы секцыі трэба прызнаць абмеркаванне прапанаваных перспектыўных напрамкаў міждысплінарнага аналізу старабеларускіх тэкстаў, а таксама іх выдання, папулярызацыі ў нашай краіне і за яе межамі

У рамках канферэнцыі была арганізавана выстава прац, падрыхтаваных супрацоўнікамі аддзела гісторыі беларускай мовы, “Жывое ў вяках беларускае слова” (манаграфіі, слоўнікі, зборнікі выбраных прац, выданні помнікаў пісьменнасці – “Александрыя”, Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588, Слуцкае Евангелле, “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”, “Баркулабаўскі летапіс”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Па выніках работы канферэнцыі быў апублікаваны зборнік навуковых артыкулаў “Гістарычнае мовазнаўства ў кантэксце міждысцыплінарных даследаванняў” (Мінск: Права і эканоміка, 2017. – 350 с.).

Акрамя таго, у рамках канферэнцыі 26 кастрычніка была праведзена прэзентацыя “Гістарычнага слоўніка беларускай мовы” ў 37 выпусках, прымеркаваная да завяршэння работы над гэтым фундаментальным праектам айчыннай гуманітарыстыкі. У мерапрыемстве прынялі ўдзел Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі У. Р. Гусакоў, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў А. А. Каваленя, Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь І. А. Марзалюк і член названай камісіі А. М. Анісім, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі А. І. Лакотка, першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце названага цэнтра А. А. Лукашанец, дырэктар філіяла “Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа” названага цэнтра І. Л. Капылоў, дырэктар філіяла “Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы” названага цэнтра д. ф. н. І. В. Саверчанка, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі к. г. н. В. Л. Лакіза, загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ д. ф. н. М. Р. Прыгодзіч, загадчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ імя Максіма Танка д. ф. н. Т. Р. Трафімовіч, дацэнт гэтай ўстановы к. г. н. І. А. Груца, рэдактары выдавецтва “Беларуская навука” Г. К. Кісялёў і Т. А. Гарбачэўская, супрацоўнікі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, вучоныя рэгіянальных вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, студэнты факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка разам з дацэнтам В. Г. Качан.

На мерапрыемстве прысутнічалі супрацоўнікі аддзела гісторы беларускай мовы інстытута – сучасныя і былыя, якія ў розны час працавалі над “Гістарычным слоўнікам беларускай мовы”: член-карэспандэнт НАН Беларусі А. М. Булыка, д. ф. н. А. І. Яновіч, к. ф. н. І. І. Крамко, к.ф. н. Л. І. Рабаданава, к. ф. н. Г. К. Ціванова, Н. Ц. Кажура, Р. С. Гамзовіч,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Т. І. Блізнюк, З. А. Кудрэйка, А. А. Напорка, Г. В. Лапцёнак, к. ф. н. А. Р.Хромчанка, к. ф. н. І. У. Будзько, к. ф. н. Н. В. Паляшчук, к. ф. н. Э. В. Ярмоленка, Г. У. Федарэнка, С. М. Макітрук, Н. В. Волкава, к. ф. н. І. У. Капцюг, уклад кожнага з іх у стварэнне слоўніка быў адзначаны граматамі і падзякамі. Удзельнікі прэзентацыі ў сваіх выступленнях адзначылі навуковую, практычную і сацыяльную значнасць “Гістарычнага слоўніка беларускай мовы”, неабходнасць яго выкарыстання ў мерапрыемствах па захаванні, перадачы і папулярызацыі спадчыны беларускага народа, падкрэслілі яго ролю ва ўмацаванні статусу гуманітарнай навукі Беларусі на міжнародным узроўні.

*Н. В. Паляшчук (Мінск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ